*С.А. Паўлава, Л. А. Дзямешка*
БДУКіМ, Мінск

# САЦЫЯЛЬНАЯ ЗНАЧНАСЦЬ ПРАЕКТНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК: ТЭАРЭТЫЧНАЕ АСЭНСАВАННЕ

*Развіццё грамадства ведаў на падставе інфарматызацыйных працэсаў патрабуе ўдасканалення работы бібліятэк у розных кірунках. Адметнай асаблівасцю на сучасным этапе з 'яўляецца праектная дзейнасць бібліятэк, якая ўсё яскравей набывае характар сацыяльнай накіраванасці. Праектаванне становіцца адной з галоўных характарыстык сацыякульпурнай дзейнасці бібліятэк, спрые ўкараненню інавацый, праяўленню ініцыятывы, уменню прыцягваць і выкарыстоўваць дадатковыя рэсурсы, прымаць кіраўнічыя рашэнні, наладжваць узаемаадносіны з органамі ўлады, грамадскасцю, партнёрамі.*

*The development of a knowledge society on the basis of information processes demands the improvement of the work of libraries divergently. The feature of work of libraries becomes the project activity, which all get the character of a social orientation more brightly. The projecting promotes the introduction of innovations, the display of initiative, the ability to find and use additional resources, to make the administrative decisions, to interrelate with authorities, the public and partners.*

У Рэспубліцы Беларусь дзейнічае разгорнутая бібліятэчная сістэма, якая ўключае каля 10 тысяч публічных і спецыяльных бібліятэк Міністэрства культуры з сукупным фондам каля 250 млн экзэмпляраў. Акрамя іх сетка навукова-тэхнічных бібліятэк налічвае 469, медыцынскіх - 180, праф-саюзных — 240, школьных - 3840, воінскіх часцей - 98, аграпрамысловага комплексу - 80, ВНУ-57, акадэмічных - 12, царкоўных - 341 [1].

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «О библиотечном деле в Республике Беларусь» публічныя бібліятэкі фінансуюцца за кошт бюджэтаў мясцовых органаў улады. Гэта значыць, што бібліятэка становіцца актуаль- ным суб'ектам рыначнай эканомікі; адпаведна эфектыўнасць яе работы вызначаецца па рэальных справах, якія нельга выконваць без праяўлення і ўдасканалення праектнай дзейнасці.

На высокім узроўні маніторынг праектнай дзейнасці ўсіх бібліятэк краі- ны здзяйсняе Нацыянальная бібліятэка Беларусі — рэспубліканскі інфар- Мацыйны, метадычны, каардынацыйны і сацыякультурны цэнтр, вядучая ўстанова Беларусі ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства. Сацыяльную аснову ў мінулым мелі комплексныя праекты бібліятэкі «Книга и чтение в жизни советского общества» (1971-1974), «Рациональное размещение и использование библиотечных ресурсов в стра- не» (1981-1985). На сучасным этапе актуальнасць набываюць навуковыя праекты фарміравання і выкарыстання электронных інфармацыйных рэсурсаў «Рынак інфармацыйных рэсурсаў і Нацыянальная бібліятэка Беларусі» (2005), «Электронныя інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і іх выкарыстанне чытачамі. Базы дадзеных і вэб-рэсур- сы» (2007-2008), «Изучение спроса потенциальных потребителей БД "Беларусь: от прошлого до настоящего"» (2007-2008). Актыўны ўдзел прымае бібліятэка ў стварэнні і рэалізацыі міжнародных праграм і праекта «Сумесна з бібліятэкамі, архівамі і музеямі Расіі, Украіны, Літвы і Польшчы падрыхтавана пры падтрымцы ЮНЕСКА намінацыйнае дасье на рэалізацыю буйнога міжнароднага праекта «Радзівіліяна», мэтаю якога з'яўляец ца віртуальная рэканструкцыя духоўнай спадчыны старажытнага бела- рускага роду Радзівілаў.

Буйным у плане двухбаковага супрацоўніцтва з Расіяй з'яўляецца праект «Сокровища славянской культуры», які прадугледжвае стварэнне элекроннай бібліятэкі, аб'ядноючай сацыяльна значныя помнікі кніжнай куль- туры дзвюх краін - Беларусі і Расіі [2].

На дзяржаўным узроўні сацыяльную значнасць набываюць сумесныя праекты Міністэрства культуры, Міністэрства абароны і аховы здароўя, Міністэрства аховы прыродных рэсурсаў, Таварыства Чырвонага Крыжа і інш.

Вялікі рэзананс у грамадстве атрымала работа бібліятэк у межах праекта «Чысты свет». Падчас гэтай акцыі бібліятэкі не толькі стварылі базу даных па духоўнай адукацыі, але і правялі асветніцкую працу, расказалі карыстальнікам пра ўнікальную беларускую школу іканапісу, у прыватнасці, жывапісную школу XVI - пачатку XIX ст. На выставах чытачы змаглі ўбачыць нацыянальныя святыні «Маці Боская Адзігітрыя», «Параскева Пятніца», «Маці Боская Іерусалімская», «Нараджэнне Багародзіцы», «Апосталы Лука і Сымон», «Пакланенне вешчуноў», «Троіца старазапаветная», «Маці Боская Замілаванне», «Успенне», «Троіца новазапаветная», «Варвара-пакутніца» і інш. [3, с. 65-66].

Гэтыя прыклады сведчаць аб аптымізацыі праектнай дзейнасці бібліятэк, аб яе запатрабаванасці ў грамадстве. Між тым тэарэтычныя асновы сацы- яльна-арыентаванай праектнай дзейнасці бібліятэк, у прыватнасці кіраван- не праектамі, вымагае больш пільнага разгляду і асэнсавання. Нават само вызначэнне паняцця «праект» мае шмат дэфініцый, а між тым на яго падставе будуецца як метадалогія кіравання, так і класіфікацыя праектаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У агульным разуменні праект - гэта мэтанакіраванае змяненне матэ- рыяльнай і духоўнай сістэмы. З існуючай разнастайнасці вызначэнняў праектаў (камерцыйных і некамерцыйных) звернем увагу на тыя, якія ад- люстроўваюць спецыфіку бібліятэчнай справы. Для бібліятэкі як сацыяль- нага інстытута характэрна некамерцыйная мэтаасэнсаваная дзейнасць. Праект выступае як вынік дзейнасці, накіраваны на карысць грамадства ўвогуле або ў інтарэсах асобных груп насельніцтва. Асноўнай мэтай не- камерцыйных праектаў з'яўляецца дасягненне пэўнага сацыяльнага эфек- ту. Вядома, існуюць і камерцыйныя праекты, і ім таксама нельга адмаў- ляць у дасягненні некаторага сацыяльнага эфекту. Але вызначальным фак- тарам рэалізацыі камерцыйных праектаў з'яўляецца магчымасць атры- мання пэўнага фінансавага прыбытку ці матэрыяльнай выгады. Такім чы- нам, асноўнае адрозненне некамерцыйных праектаў заключаецца ў тым, што дасягненне сацыяльнага эфекту для іх з'яўляецца прыярытэтным. Ад- розненнем некамерцыйных праектаў з'яўляюцца таксама іншыя крыніцы і характар фінансавання, якія могуць быць аб'яднаны ў пэўныя групы: фінансаванне за кошт дзяржавы і органаў мясцовага самакіравання; фінансаванне за кошт прыватных недзяржаўных арганізацый; фінансаван- не за кошт фізічных асоб. Напрыклад, бібліятэчны праект «Жыццю пат- рэбна міласэрнасць» ажыццяўляўся з дапамогай сродкаў органаў мясцо- вага самакіравання. За кошт дзяржаўных сродкаў быў здзейснены ману- ментальны праект «Памяць Беларусі», які даў магчымасць правесці вялі-
кую работу па рэестры і захаванні нацыянальна-культурнай спадчыны народа - дакументных помнікаў, найбольш значнымі і каштоўнымі з якіх адзнчаны рукапісы і старадрукаваныя выданні. Дарэчы, іх колькасць складае ў бібліятэках каля 250 тысяч, у музеях - каля 220 тысяч, у архівах - каля 280 тысяч адзінак захоўвання [4, с. 64—65].

Існуе таксама тэрмін «сацыяльны праект», вызначэнне якому даў В. І. Варапаеў: гэта «праект у галіне рэфармавання сістэмы сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, сацыяльнай абароны незабяспечаных слаёў насельніц- тва, пераадолення вынікаў прыродных і сацыяльных катастроф» [5, с. 20]. Такое трактаванне тэрміна, на наш погляд, невычарпальнае, яно абмяжоўвае ці звужвае магчымасці рэалізацыі сацыяльных праектаў у розных сферах, у тым ліку ў галіне культуры, палітыкі, вытворчасці і інш.

І ўсе-такі ў бібліятэчнай сферы выкарыстоўваюцца і тэрмін «сацыяльны праект», і тэрмін «некамерцыйны праект». Агульным крытэрыем іх эфектыўнасці з'яўляецца дасягненне пастаўленых мэт з сацыяльнага, экалагічнага, этычнага, выхаваўчага, а не з фінансавага пунктаў гледжання.

У выніку рэалізацыі некамерцыйнага праекта ўзнікае некамерцыйны прадукт як вынік дзейнасці, не звязаны з атрыманнем прыбытку і прызначаны для некамерцыйнага абмену [6, с. 11]. Прыкладамі некамерцыйных прадуктаў у бібліятэчнай сферы могуць быць ідэі, канцэпцыі, праграмы; паслугі (інфармацыйныя, адукацыйныя); тавары, не прызначаныя для камерцыйнай рэалізацыі (гуманітарная дапамога, дакументы, базы даных, сайты), і інш. Іх спажыўцамі з'яўляюцца грамадства ўвогуле, групы на- сельніцтва і асобныя індывіды.

Засяродзім увагу на асэнсаванні кіравання некамерцыйнымі бібліятэч- нымі праектамі. Праектнае кіраванне больш дэталёва сфарміравалася ў другой палове XX ст. і трактавалася як тып менеджменту, як метад кіравання або як арганізацыйная структура для распрацоўкі праектаў і праграм. Некаторыя яго мадыфікацыі выкарыстоўваюцца ў бібліятэчнай сферы. Да яго вызначэння існуюць розныя падыходы. Тэорыю кіравання праектамі (праектны менеджмент) шмат спецыялістаў разглядаюць як агульную тэхналогію, якая дапамагае бібліятэкам арганічна ўвайсці ў сістэму сацыяльна-культурнага праграмавання [7]; эфектыўна ўдзельнічаць у новых кірунках бібліятэчнага менеджменту - мэтавых праграмах [8]; перспектыўна развівацца ў межах карпаратыўных сістэм [5]; стаць сістэмаўтваральнай асновай пры распрацоўцы рэгіянальных праграм сацыякультурнага развіцця краіны [9]. Передумовамі найбольшай актывізацыі праектнай дзейнасці даследчыкі лічаць ліквідацыю планава-распараджальнай сістэмы, фарміраванне прававога рэгулявання; дэцэнтралізацыю кіравання; пэўныя змяненні ў псіхалогіі кіраўнікоў, развіццё камп'ютарных тэхна- логій [10]. З гэтым можна цалкам пагадзіцца, калі прыняць пад увагу, што кіраванне праектамі з'яўляецца асобным тыпам кіравання, патрабуючым адпаведнай камбінацыі ўсіх яго параметраў: структуры, сістэмы кіравання, размеркавання функцый, пабудовы і выкарыстання спецыялізаванай тэхналогіі, арганізацыі кіравання. Але, на наш погляд, найбольш прымальнымі для бібліятэчнай справы з'яўляюцца наступныя трактоўкі: «Кіраванне праектам разумеецца як кіраванне працэсамі змянення існуючых сістэм, накіраваных на дасягненне мэты праекта, а таксама прытрымліваецца запланаваных рэсурсаў і часовых затрат» [8, с. 5]; «Кіраванне праектамі - гэта мастацтва кіраўніцтва і каардынацыі намаганняў людзей і выкарыстання рэсурсаў на падставе дасягненняў сучаснай навукі і інфармацыйных тэхналогій для паспяховага здзяйснення мэтаў праекта па выніках,
каштоўнасці, часу і якасці» [11, с. 15]. Існуючыя падыходы справядліва ад- люстроўваюць розныя аспекты ў трактоўцы гэтага шматгранната паняцця. На нашу думку, неабходна вызначыць месца і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формы праектнага кіравання ў фарміраванні сацыяльна-культурнага асяроддзя рэгіёну. Менавіта гэта дае шырокія магчымасці ўдзелу бібліятэк у рэалізацыі праектаў сацыяльнай накіраванасці.

Аснову канцэпцыі кіравання праектамі складае погляд на праект як на кіруемае змяненне зыходнага становішча любой сістэмы, звязанае з затратамі часу, сродкаў і рэсурсаў.

Спецыялістам у галіне кіравання некамерцыйнымі праектамі ў бібліятэчнай сферы мэтазгодна прытрымлівацца сістэмнага падыходу, які дазваляе пэўным чынам структураваць веды, функцыі, працэсы, працэдуры, дакладна вызначаць мэты і задачы, знаходзіць паслядоўнасць іх рашэння і эфектыўныя тэхналагічныя ўзаемасувязі [12].

Сістэмны падыход да кіравання некамерцыйнымі праектамі можна ўявіць у выглядзе мадэлі, якая ўключае суб'екты, аб'екты, працэс кіравання.

Суб'ектамі кіравання з'яўляюцца каманды і ўдзельнікі праекта, якія ў адпаведнасці са сваімі задачамі, паўнамоцтвамі і кампетэнцыямі ўзаемадзейнічаюць пры выпрацоўцы і прыняцці кіраўнічых рашэнняў у працэсе ажыццяўлення праекта.

Асноўнымі ўдзельнікамі праекта могуць быць:

• арганізацыі, якія фінансуюць бібліятэчны праект (спонсары, дабрачынныя арганізацыі і інш.);

• кіраўнічыя арганізацыі (бібліятэкі, якія маюць статус юрыдычнай асобы, некамерцыйныя арганізацыі);

• выканаўцы (супрацоўнікі бібліятэкі, арганізацыі і фізічныя асобы, якіх наймае кіруючая арганізацыя для выканання той ці іншай работы);

• сувыканаўцы (арганізацыі, якія выконваюць пэўную частку работы за кошт сродкаў фінансуючай арганізацыі).

Каманда праекта складаецца з кіраўніка, прызначанага загадчыкам бібліятэкі, выканаўцаў - членаў праектнай групы (функцыянальных менеджэраў праекта).

Аб'ектамі кіравання з'яўляюцца: бібліятэчныя праекты; праектна-арыентаваная дзейнасць бібліятэкі; праектна-арыентаваная дзейнасць у сістэме бібліятэк, а таксама фазы жыццёвага цыкла аб'екта кіравання: канцэпцыя, распрацоўка, рэапізацыя, завяршэнне праекта.

Пад працэсам кіравання праектам разумеецца структурная дэкампазіцыя задач і працэдур кіравання, з дапамогай якіх ажыццяўляецца ўздзеянне суб'ектаў кіравання на аб'екты.

У аснову класіфікацыі задач кіравання праектамі пакладзены тэрміновыя ўзроўні, функцыянальныя вобласці і стадыі кіравання.

Тэрміновыя ўзроўні могуць ахопліваць увесь жыццёвы цыкл праекта; абмяжоўвацца выкананнем работ, запланаваным на працягу года; квартальным выкананнем работ і ў выключных выпадках месячным і аператыўным узроўнем кіравання, калі выкананне работ праекта запланавана на месяц, дэкады, тыдні і г. д.

Функцыянальныя вобласці кіравання вырашаюць такія задачы і працэдуры, як кіраванне прадметнай вобласцю праекта, выкананнем праекта ў вызначаны тэрмін, каштоўнасцю, якасцю, рызыкамі, персаналам, камунікацыямі, змяненнямі ў праекце.

Сярод стадый працэсу кіравання вылучаюцца: выпрацоўка канцэпцыі праекта і яго складовых частак; працэсы арганізацыі фінансавання; плана-
ванне работ; арганізацыя і кантроль выканання работ; аналіз і рэгуляванне хода работ; закрыццё праекта і яго частак.

Выкарыстанне такой сістэмы метадалагічнай мадэлі дазваляе не толькі вызначыць функцыі, працэсы, задачы ўсіх удзельнікаў, але і распрацаваць метады, мабілізаваць сродкі і ўсе віды забеспячэння вырашэння патэнцыяльных задач; акрэсліць эфектыўныя тэхналагічныя ўзаемасувязі і паслядоўнасць рашэння задач кіравання праектам; выкарыстаць агульную пра- фесійную мову і тэрміналогію ў галіне кіравання праектамі.

Пры гэтым патрэбна адзначыць, што загадчыкі бібліятэк часта слаба валодаюць навуковымі метадамі кіравання праектнай дзейнасцю, што зніжае сацыяльны вынік ці пакідае не зусім рэалізаванымі значную частку дастойных увагі бібліятэчных праектаў. З другога боку, узнікае прафанацыя метада кіравання (праектная дзейнасць становіцца «моднай», але не зусім прафесійнай). Таму мы звярнулі ўвагу на тэарэтычнае і метадычнае асэнсаванне праблемы кіравання некамерцыйнымі праектамі ў бібліятэчнай сферы, падкрэсліваючы іх асаблівую ролю ў сацыякультурным развіцці грамадства.


Спіс літаратуры

1. Бягучы архіў навуковага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Бе- ларусі за 2009 год.

2. *Мотульский, Р. С.* Национальная библиотека Беларуси / Р. С. Мотульскнй. - Мінск: Белорус. гос. ун-т культуры н нскусств, 2009. - С. 74, 85, 96-97.

3. *Дзямешка, Л. А.* Асветніцкая і адукацыйная місія публічных бібліятэк Беларусі / Л. А. Дзямешка // Адукацыя і выхаванне. - 2008. - № 9. - С. 65-66.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Шышкін, У. А.* Бібліятэкі Беларусі / У. А. Шышкін // Беларуская культура сён- ня. - Мінск: Мін-ва культуры, 2008. - С. 58-67.

5. *Воропаев, В. М.* Управленне проектамн в России: основные понятия. История. Достижения. Перспективы / В. М. Воропаев. - М.: Аланс, 1995 - 225 с.

6. *Андреев, С. Н.* Маркетинг некоммерческих субг.ектов / С. Н. Андреев. - М.: ФИНПРЕСС, 2002. - 320 с.

і 7. *Злотникова, З. И.* Библиотека в системе социально-культурного программирования / З. Н. Злотникова, Н. М. Суслова // Библиотековедение. - 2002. - № 2. - С. 32-37.

8. *Логчнов, Б. О.* Участие в целевых программах: новое направление библиотечного менеджмента / Б. О. Логинов // Учреждения культуры: справ. рук. - 2003. - №1. - С. 9-14.

9. *Брижатова, С. Б.* Системообразующие основания разработки региональных программ социально-культурного развнтия в России: автореф. дис... канд. пед. наук / С. Б. Брижатова- М., 2001. - 18 с.

10. *Жадько, Н. В.* Проектное развитие библиотек / Н. В. Жадько. - М.: Елена, 2000. - 96 с.

11. *Воройский, Ф. С. О к*орпоративных библиотечных системах и перспективах их развития в России / Ф. С. Воройский // Информ. ресурсы России. - 2001. - № 3-4. - С. 7-10.

12. *Воропаев, В. М.* Системный подход к управлению проектами и программами / В. Н. Воропаев, Г. Н. Секлетова // Управление проектами. - 2005. - № 3(3). - С. 20- 29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ